Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 2 (219)

■ Прэм'ера

ВЕНДЭТА НАВАГРАДСКАГА ГАТУНКУ

Як спыніць кроўную варожасць: варыянт Адама Міцкевіча прапанаваў Купалаўскі тэатр

Маладому графу ёсць за што помсціць шляхціцу Тадэвушу: кроў прадстаўніка роду Гарэшкаў на яго бацьку, ды й маёмасць — замак — трэба вяртаць. І ніякіх перамоў!.. Калі трэба, мячы дастаць гатовыя ўсе: тыя, хто за Сапліцаў, і тыя, хто за Гарэшкаў. Гонар жа роду абараніць трэба. Кроў пральецца. Але не толькі гаспадароў гэтых земляў... Здаецца, што ўсё безнадзейна: пазабіваюць адзін аднаго. Дзяўчаты гублюць прытомнасць, імкнучыся спыніць сваіх каханых. Але гэта не тое, што насамрэч можа іх спыніць...

Пра тое, што можа іх спыніць, напісаў паэт Адам Міцкевіч у 30-я гады XIX стагоддзя, калі знаходзіўся ў Парыжы. Можа, таму, што праз пэўны час і на адлегласці было больш адчувальна тое, што стала глебай для стварэння паэмы «Пан Тадэвуш», буйнога эпічнага твору свайго часу.

На адлегласці Міцкевіч фактычна прызнаваўся ў любові да сваёй радзімы, узгадваючы мілыя краявіды, жыццёвы ўклад, традыцыі бясед, палявання, дух замкаў і вёсачак, сустрэч у карчме ці на балі... Тое, што паўстае з паэмы, нават калі сочыш у ёй за развіццём фабулы: адносін, перыпетый кахання і варожасці галоўных герояў. І зразумела: усе яны прыдуманы ім толькі для аднаго: каб распавесці пра Любоў. Пра высокую любоў да Радзімы, якая прымірае тых, хто не хоча прымірацца. Але праз якую лепш разумееш сутнасць чалавечага кахання да жанчыны — бо рознае разуменне любові да радзімы таксама дапамагае людзям утвараць пары. Міцкевіч распавёў пра тую любоў, якая ў нейкія моманты вымагае ад чалавека поўнага адрачэння ад сябе, сваіх інтарэсаў, выгады, зручнасцяў. І тады становіцца не важна, якая даўжыня і наогул будучыня тваёй дарогі ў гэтым свеце, таму што важна тое, што важна для Яе. Галоўнае — будучыня любімай краіны, памяць пра якую жыве нават тады, калі яе назва не існуе на палітычнай карце свету, як гэта было ў XIX стагоддзі. Таму і ў паэме яна называецца па-рознаму ў залежнасці ад таго, хто пра яе гаворыць.

Патрыятызм, у аснове якога ляжыць вечнае пачуццё любові, — тэма актуальная заўсёды. Рэжысёр спектакля «Пан Тадэвуш» Мікалай Пінігін хацеў пагаварыць з намі пра любоў да радзімы і выбраў для гэтага выдатны твор, прасякнуты гэтай любоўю. Цягам спектакля мы разумеем, што ўкладвалася ў гэтае паняцце ў часы Міцкевіча. Але адна справа — паэма. Зусім іншае — спектакль на драматычнай сцэне. Адназначна ацаніць яго немагчыма. Таму засяродзімся на момантах, якія здаюцца больш важнымі і паказальнымі.

5. Выдатна, што звярнуліся да цудоўнага твора Міцкевіча, якога дагэтуль шмат хто з нашых суграмадзян працягвае па інерцыі лічыць польскім паэтам. Так, пісаў па-польску, часткова і таму, што сам страціў радзіму, вымушаны быў з'ехаць і весці жыццё эмігранта. І менавіта гэтая паэма найлепш тлумачыць факт біяграфіі аўтара, дазваляе зразумець яго творы: чаму ў іх столькі «нашага» — у згадках пра нейкія традыцыі ці абрады, у назвах і апісаннях краявідаў, у адлюстраванні гістарычных падзей. «Пан Тадэвуш» — твор пра тое, як можна заставацца патрыётам, нават страціўшы радзіму. Тое, што Міцкевіч дэманстраваў сваім жыццём. І мы яго бачым напачатку — праўда, у выглядзе... помніка, які вядзе гаворку пра культурную адметнасць народа (напрыклад, моўную). Але думаецца, што менавіта ў гэтым народзе няма стаўлення да Міцкевіча як да помніка (хоць помнікі і ёсць): яго ідэі, тэмы, думкі нам яшчэ спасцігаць і чытаць, чытаць...

4. Добра, што ёсць магчымасць чытаць творы Адама Міцкевіча ў перакладзе на беларускую мову. І добра, што ёсць магчымасць далучацца да яе праз тэатральныя пастаноўкі яго паэм «Дзяды» («Тэатр «Ч») і «Пан Тадэвуш» (Купалаўскі): заўсёды ёсць частка людзей, якія аддаюць (на жаль) перавагу візуальнай культуры, ім важна ўбачыць герояў Міцкевіча. Зразумець паэта праз тэатр — таксама добры варыянт. Ключавое слова тут «зразумець». Некаторым бывае дастаткова. І ёсць вялікая частка тэатральных гледачоў, якія звернуцца да самой паэмы — да ці пасля спектаклю. І зробяць правільна: таму што лірызм, растворары ў радках паэмы, шматлікіх апісаннях і аўтарскіх адступленнях, на сцэне саступае першынство сюжэту, у якім ёсць чатыры галоўныя героі.

3. Задаволіць цікавасць пэўнай часткі публікі гэтым таксама можна. За каханнем прыгожых паненак з высакароднымі маладымі людзьмі назіраць забаўна: тагачасны рамантызм, які Міцкевіч увасобіў у лініі кахання, можа сёння здавацца трошкі наіўным, і акцёры іграюць так, каб гэтую наіўнасць нават падкрэсліць, часам пераводзяць у фарс (ці не з-за сённяшняга нашага лёгкага стаўлення да гэтага пачуцця?). Хоць гэтыя словы і развагі Міцкевіч пісаў абсалютна сур'ёзна ў адпаведнасці з духам часу (рамантызм жа!). А развагі, якога хлопца лепш выбраць і чаму, напэўна, па сутнасці мала змяніліся. І сярод сучасных паненак у час прагматызму таксама знойдуцца такія, хто будзе думаць пра тое, наколькі яе выбраннік шчыра любіць радзіму. Талімэна, напрыклад, пра Тадэвуша гаворыць: «Сапелкава хвароба://апроч айчыны, нішто не даспадобы». Саперніцтва яго з Графам пачынаецца ж таксама на глебе кахання: адзін сустракае Зоську і захапляецца ёй, і другі на яе вока кінуў. Адзін заляцаецца да Талімэны, і другі круціць з ёй. Але ў выніку кожны знайшоў сваю пару па духу. І кожная з паненак гатовая чакаць свайго каханага з вайны.

2. Абодва героі выпраўляюцца на вайну на баку Напалеона. Граф, падобна да вядомага з гісторыі героя Дамініка Радзівіла, гатовы сфарміраваць сваё войска. Мясцовая шляхта такім чынам мела спадзяванне на адраджэнне сваёй краіны. Ксёндз Робак, які ўвесь гэты час уводзіў у курс, што адбываецца ў Еўропе, выканаў місію святара: блаславіў свайго сына Тадэвуша на шлюб. Насамрэч шлюбаў на сцэне два. Усе шчаслівыя і танчаць паланез напярэдадні паходу з генералам Дамброўскім. На гэтым аўтар пакідае сваіх герояў. Далей у Міцкевіча — эпілог, вельмі ўзнёслы, пранікнёны і настальгічны. Шкада, што толькі частка яго высокіх слоў гучыць са сцэны.

1. Адзінае, што заўважна трактаваў Мікалай Пінігін як рэжысёр — менавіта эпілог. Таму што ўвесь спектакль ідзе ўслед за паэмай. «Пан Тадэуш» пастаўлены так, як яго маглі б паставіць у XIX стагоддзі, з якога ён родам (хіба што сучасныя магчымасці сцэны дазваляюць карыстацца тэхнікай і відэапраекцыяй). Па сутнасці, мы ўсё ж маем ілюстрацыю і агучванне ідэй паэмы тэатральнымі акцёрамі. Гэта тэатральная пастаноўка паводле класіка Міцкевіча. І пра тое, як любілі радзіму ў XIX стагоддзі. Як гатовыя былі ахвяраваць сабой. Момант ахвяры якраз і паказаны ў пастаноўцы: разбітае напалеонаўскае войска ратуецца ад суровай зімы і моцнага снегу, цягне звергнутыя штандары...

0. Гісторыя. Гісторыя і нічога апроч гісторыі. Хоць і хацелася, каб праз гэтую гісторыю падаваліся развагі пра тое, што значыць патрыятызм у XXI стагоддзі. Ці наш беларускі час спыніўся, калі нам усё яшчэ здаюцца дужа магутнымі ідэі стагоддзя XIX? Ці жывём? Калі нават у тэатры жыццё паказваецца павольна, інертна і, здаецца, зусім няма ў ім руху...

Жывём. І справы часу назіраем тут жа. Тадэвуш вуснамі акцёра Паўла Харланчука ў фінале прамаўляе ўзнёслыя словы Міцкевіча з эпілога на фоне брамы, якая на нашых вачах пачынае рассыпацца, пакрывацца мхом, гарыць. Але штосьці з рэшткаў тых брам, палацаў, замкаў дагэтуль захоўвае «Той край убогі, цесны, але шчасны//Як Божы свет, быў гэткі наш уласны!»

Ларыса ЦІМОШЫК.
Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

Мастак з Гомеля Валерый Ляшкевіч

20 ГАДОЎ ЖЫВЕ НА ВУЛІЦЫ

А днямі ў Нацыянальным мастацкім музеі адбылося адкрыццё яго выставы

І не толькі выставы. Адбыўся яшчэ і паказ дакументальнага фільма «Скрыжаванне» рэжысёра Настассі Мірашнічэнкі пра жыццё, творчасць і філасофію (так-так, менавіта філасофію!) мастака. На гэтае незвычайнае мерапрыемства сабралася даволі шмат народу. Асабліва калі ўлічваць, што мастака добра ведаюць гамяльчане, а вось у сталіцы пра яго мала хто чуў. За столькі гадоў жыцця на вуліцы гамяльчане прывыклі да Валерыя Ляшкевіча. Заўважаць яны яго, вядома, не перасталі, бо не заўважыць гэтага добрага, усмешлівага, ахайнага (нягледзячы на вулічнае жыццё) дзядулю немагчыма. Ён дрэнна арыентуецца ў рынкавых коштах на мастацтва і прадае свае карціны або рэпрадукцыі проста на вуліцы за «хто колькі дасць». Стаіць ён заўжды на адным і тым жа месцы — на Кіеўскім спуску ў Гомелі. Як талісман. Як сімвал. Бо Валерый Ляшкевіч здолеў, у адрозненне ад большасці з нас, перамагчы сістэму ў жыцці, асяродку, сабе.

Ён жыве на вуліцы, але ён не залежыць ні ад кога і ні ад чога. На грошы, зароблены ад продажу карцін, ён ходзіць у лазню і цырульню. Ён думае, што мусіць выглядаць прыстойна, бо яму даводзіцца кантактаваць з людзьмі. Валерый Ляшкевіч не проста дэманструе і прадае свае карціны. Ён тлумачыць гледачам, пра што яго мастацтва, заклікае іх разважаць.

Ёсць у фільме Настассі Мірашнічэнкі такі эпізод, калі на Кіеўскім спуску мастак развешвае свае карціны на вяровачцы, а побач гуляюць дзеці, разглядаюць. І мастак ім кажа:

— Вы выставу глядзіце і думайце, чаму так намалявана!

Пошукі спонсара

Шчыра кажучы, я доўга думала, як напісаць гэты артыкул. Як рэцэнзію на фільм або выставу? Але як можна напісаць проста рэцэнзію, калі фільм Настассі Мірашнічэнкі — гэта хутчэй не твор кінамастацтва, а праява жыцця, спагады і чалавечнасці. Цэлы год выключна на ўласныя сродкі ўся здымачная група фільма (сцэнарыст Алена Антанішына, гукарэжысёр Святлана Сокал, аператар Аляксандра Мароз, відэаінжынер Варфаламей Курага, аўтар музыкі Аляксей Варсоба з гурта «ПортМанэ») дапамагала свайму герою, чым толькі магла, адначасова назіраючы за ім і запісваючы на камеру яго рэальнае жыццё, у якое надзвычай цяжка паверыць звычайнаму чалавеку.

— Пэўны час таму, — распавядае рэжысёрка, — я даведалася пра Валерыя Ляшкевіча і ўсё хацела зняць пра яго фільм. Але ва ўсіх месцах, дзе я ў той ці іншы час працавала, такая тэма для фільма не ўхвалялася. І я стала шукаць спонсара. Але аказалася, што ў Беларусі і спонсара знайсці на такія дакументальныя праекты немагчыма. У нас лепей праспансуюць які-небудзь open air, чым дапамогуць зняць фільм пра чалавека, які на вуліцы ўсё жыццё пражыў. У выніку мы вырашылі здымаць фільм самі. Траціліся хіба што на квіткі. Ну і так — паесці. Дапамагалі Валерыю, чым маглі. І цяпер, безумоўна, я не спадзяюся, што гэты фільм пакажуць па нашым тэлебачанні і не думаю, што на ім змагу зарабіць. Мне важна дапамагчы чалавеку з унікальным унутраным светам, які стаў ужо для ўсёй нашай каманды блізкім, прыцягнуць да яго асобы і творчасці ўвагу людзей, якія, можа быць, фінансава змогуць яму дапамагчы больш, чым я.

Настасся распавяла, што на прэзентацыі ў Нацыянальным музеі да яе падыходзілі некалькі самавітых людзей, казалі, што будуць думаць, чым могуць дапамагчы мастаку. А я вось у сувязі з гісторыяй Валерыя Ляшкевіча ўсё ўзгадваю лёс Вінсэнта Ван Гога. Ды і не толькі ж у яго аднаго быў такі трагічны лёс. Калі мастак жыў у поўнай галечы і занядбанасці, а праз які дзясятак гадоў пасля яго смерці творы прадаваліся на самых буйных аўкцыёнах за велізарныя грошы. Апагей несправядлівасці...

Не гнацца за Рафаэлем

Праўда, сам гомельскі мастак не лічыць сябе няшчасным чалавекам. Гранічна шчыры, не разлаваны і не пакрыўджаны на жыццё, ён захапляе сваёй жыццярадаснасцю. Ён кажа, што не гоніцца за Рафаэлем і што ў яго ёсць некалькі такіх карцін, праз якія можа сказаць, што пражыў жыццё не дарэмна.

— Я сімваліст, таму што мяне жыццё прымусіла ім быць, а не таму, што так люблю сімвалізм. Я проста аналізую, што ў жыцці адбываецца, і адлюстроўваю гэта на паперы, — распавядае Валерый Ляшкевіч у фільме «Скрыжаванне».

Усяго адзнятага матэрыялу, дарэчы, ажно 60 гадзін! І стваральнікам вельмі цяжка было выбраць, што ж пакінуць у фільме працягласцю крыху больш за гадзіну. Так што, калі раней Настасся Мірашнічэнка працавала над дакументальнымі драмамі пераважна для тэлебачання («Звязда» пісала, напрыклад, пра яе фільмы «Легенды Нясвіжа» і «Фаўст Радзівіла»), то фінальны варыянт «Скрыжавання» ствараўся пераважна на стадыі мантажу. У выніку атрымаўся фільм-назіранне з вялікай колькасцю закадравага тэксту. Гэта маналог Валерыя Ляшкевіча, яго расповед пра жыццё. Як ён, напрыклад, ходзіць у кнігарню, каб пачытаць кнігі. І як спачатку прадавачкі ставіліся да яго насцярожана і выганялі, а потым прызвычаіліся, зразумелі, што ён бяскрыўдны, з кнігамі — асцярожны, і перасталі выганяць. Часам ён так па некалькі дзён запар прыходзіць, каб нейкую кнігу прачытаць да канца. Яшчэ ён чытае газеты. І наогул вельмі адукаваны чалавек, добра ведае гісторыю мастацтва. Вучыўся ў Бранскай мастацкай вучэльні, 12 гадоў пражыў у Санкт-Пецярбургу і цяпер кожнае лета ездзіць туды маляваць на вуліцы і прадаваць свае карціны. Нейкі час добразычліўцы нават здымалі яму там кватэру, а на «Юцьюбе» ёсць аматарскае піцерскае відэа пра мастака. Але беларуская каманда зрабіла першы паўнавартасны фільм пра ўнікальнага творцу, якога мясцовыя жыхары называюць гомельскім Чурлёнісам.

— Самае складанае было, — распавядае рэжысёрка, — калі мы, правёўшы з ім пэўны час у Гомелі або Піцеры, мусілі з'язджаць, а ён заставаўся і ішоў начаваць у кардонных каробках...

Не дзеля прыгажосці

Мы прывыклі да знешняга камфорту, дабрабыту і ўладкаванасці. А Валерый Ляшкевіч пайшоў насуперак. Ён начуе на лаўках у дворыках, пад помнікамі і нават на вакзале, калі зусім пашчасціць. Так, ён дзівак. Магчыма, нават трошкі блазен. Але ён увасабляе дух свабоды. Яго нельга мераць звычайнымі меркамі, яму нельга параіць пайсці вагоны разгружаць, каб мець нібыта больш годны лад жыцця. Бо гэта іншага гатунку чалавек. Усе ж мы розныя і жывём кожны дзеля нечага рознага на гэтым свеце. Валерый Ляшкевіч жыве не дзеля прыгажосці, а дзеля праўды, калі, вядома, наогул можна патлумачыць словамі такія недасяжныя высокія матэрыі. Яго карціны трывожныя і часта цьмяныя. У розных тэхніках (аловак, туш, акрыл ды інш.) ён распавядае нам пра свае мітрэнгі і клопаты, пра культ грошай і спажывання, які завалодаў усімі...

— «Чорны квадрат» Малевіча або «Герніка» Пікаса ствараліся не дзеля прыгажосці, так і мае карціны, — тлумачыць мастак.

У Нацыянальным мастацкім музеі прадстаўлена 25 твораў мастака. Гэта тыя з 50 карцін, якія прывезла на разгляд спецыялістам-мастацтвазнаўцам рэжысёр фільма пра Валерыя Ляшкевіча. Карціны збіраліся адусюль. Некаторыя выбралі з уласнай калекцыі Ляшкевіча, некаторыя прадаставілі два гомельскія калекцыянеры, у якіх захоўваецца па 15 твораў вулічнага мастака. А наогул творы Ляшкевіча, магчыма, захоўваюцца па ўсім свеце, бо шмат людзей праходзяць міма яго імправізаваных выстаў у Гомелі і Пецярбургу, купляюць яго творы. І гэтыя людзі могуць быць з розных куткоў свету. Толькі вось мы пакуль так і не навучыліся цаніць тое, што маем.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

■ Сцежкамі мастака

ПАВОДЛЕ ЗАКОНУ АХВЯРАВАННЯ

Краіна вачыма збіральніка скарбаў Міхася Раманюка

Мы думаем: героі ў кнігах. У жыцці таксама бываюць, але ў нейкія складаныя перыяды, калі нехта робіць штосьці добрае, прыгожае, таленавітае дзеля іншых ці вырашае для сябе праблему выбару так, што хочацца схіліць галаву, захапляцца. Героі — выключныя людзі, думаем мы, апраўдваючыся: не кожнаму дадзена магчымасць праявіць сябе. Але ў кожнага яна ёсць. Стаць героем можна нават тады, калі шчыра і рупліва рабіць нейкую справу — не толькі дзеля сябе і асабістых інтарэсаў — на тым месцы, на якое накіравала цябе жыццё.

Такім чалавекам быў Міхась Раманюк — навуковец, даследчык, творца. Чалавек апантаны любоўю да Беларусі і яе адметнай культуры. Вандроўнік па роднай зямлі, дзякуючы якому наша краіна мае здабытыя як найкаштоўны скарб, уратаваныя ад знікнення ўзоры народнай культуры.

«Вандроўнік» — такую назву мае музычна-паэтычна-драматычны твор, які пакажуць на сцэне Белдзяржфілармоніі 22 студзеня. Аўтар — **кампазітарка і пастаноўшчыца Ларыса СІМАКОВІЧ,** якую нашы чытачы могуць ведаць па вялікіх праектах «Апокрыф», «Курган», «Люцыян Таполя», а таксама па спектаклі-прысвячэнні Максіму Багдановічу. З ёй мы размаўляем пра ролю творчай асобы і яе адметны шлях у гэтым свеце.

Прысвячэнне

— Міхась Раманюк для мяне — увасабленне гераічнага жыцця. Мы не ўсё заўважаем, не ўсё ведаем, таму што занятыя сваім жыццём. Недзе так яно і павінна быць. Але прыходзяць моманты ці даты (70-годдзе з дня нараджэння) як нагода ўзгадаць пра чалавека, які гераічна ціха пражыў сваё жыццё. Ціхі гераізм на гэтым і палягае: чалавек застаецца сам-насам са сваім сумленнем і сваім уяўленнем пра тое, як ён павінен паступіць. А пасля яго думкі і рашэнні выносяцца за межы асабістага існавання, і мы міжволі робімся сведкамі сапраўды гераічнага ўчынку альбо жыцця. Жыццё Міхася Раманюка гераічнае і ахвярнае ў дачыненні да Беларусі, для мяне яго ахвярнасць блізкая ахвярнасці Багдановіча. Проста мы не можам гэта да канца ацаніць, таму што ўсё яшчэ блізка, мала прайшло часу. Няма той дыстанцыі, дзе далягляд ураўнаважваецца, і мы бачым і можам ацэньваць чалавечы скарб, які маем. Нават калі праходзіць час, мы не заўсёды гатовыя належным чынам ацаніць і ўшанаваць тое, што было зроблена ў айчыннай літаратуры і мастацтве. Можна назваць шэраг магутных постацяў у беларускай культуры, але шэраг асоб дагэтуль, я лічу, недаацэнены нашымі сучаснікамі: Язэп Драздовіч, Алесь Гарун, Максім Гарэцкі, той жа Кузьма Чорны; у музыцы — Мікола Равенскі і кола кампазітараў, блізкіх яму. Але калі ўчытацца ў творы ці паціквіцца, што зроблена і ў якіх умовах, насуперак чаму, то паўстае жыццё-подзвіг. Якім было жыццё Уладзіслава Сыракомлі, яго неверагоднае каханне! Жыццё, поўнае ўзлётаў і зломаў пражыў Юльян Нямцэвіч, які быў пры імператарскім двары, але стаў ад'ютантам Тадэвуша Касцюшкі, перажыў зняволенне ў Петра-Паўлаўскай крэпасці. Столькі асоб, пра якіх хочацца гаварыць, прысвяціць ім творы!

Але такія постаці, як Міхась Раманюк, на маю думку, вельмі супадаюць з цяперашнім часам. Гэта асоба ахвярная, таму маё сумленне, мае жыццёвыя каардынаты не дазволілі мне як творцы прайсці міма. Узнікла ідэя асобнага спектакля-прысвячэння, які мае назву «Вандроўнік». Заяўка Дзяржаўнага аркестра РБ была падтрымана мастацкім саветам філармоніі і на ўзроўні Міністэрства культуры.

Міхась Раманюк быў выдатным мастаком, этнографам, заснавальнікам часопіса «Мастацтва», чалавекам, які беларускімі традыцыйнымі строямі здолеў здзівіць Парыж і Ліён. Але паказальны адзін момант у біяграфіі, які ён не афішаваў (што сведчыць пра высакароднасць). Аднойчы ў яго галаве выстраіўся лагічны ланцужок: Чарнобыль, Хойніцкі раён, высяленне... Паколькі ён ведаў Беларусь, то разумеў, што застаецца ў «зоне» і будзе страчана назаўсёды. Пасля ўзважыў, чым ён за гэта заплаціць, а потым прыйшло рашэнне...

Шлях вандроўніка

— Міхась Раманюк пайшоў з жыцця ў 53 гады ад анкалогіі, зароблена ў радыяцыйных зонах Хойніцкага раёна, калі ён збіраў там скарбы народнай культуры. Раманюк меў права выбару. Але ён рабіў тое, што мусіў. Ведаў жа пра радыяцыю і яе небяспеку: таму і паехаў у раёны, якія знаходзіліся ў зоне высялення, ратаваць — і выратаваў, што змог, цаной свайго жыцця. Гэта хрысціянскі ўчынак, на маю думку.

У маім уяўленні пра свет ёсць такая версія: наша планета Зямля існуе паводле закону ахвяры, Зерне ахвяруе сябе, каб вырас колас, зямля ахвяруе сваё цяпло, каб выраслі плады і г.д. Закон ахвярнасці можна прасачыць на ўсіх узроўнях — не толькі ў прыродзе, але і ў соцыуме, толькі ўступаюць у дзеянне больш складаныя слаі і энергіі. Калі сутыкаешся з гэтым галоўным глабальным планетарным законам і разумееш яго, то праходзіш па жыцці так, як гэта патрэбна.

Ствараючы спектакль, я не імкнулася распавесці біяграфію Міхася Раманюка. Гэта спектакль-гімн чалавеку. І спяваем яго мы тымі сродкамі, якія яму былі блізкія, выкарыстоўваючы шмат сімвалаў, метафар. Адна з іх — выкладзеная на сцэне дарога — сімвалізуе шлях вандроўніка. Герой-вандроўнік — альтэр-эга самога Раманюка. Мы яго ўбачым з тым самым фотаапаратам, з якім ён вандраваў, ягоная ж торба, плашч і капялюш. Гэтыя рэчы даў на карыстанне сын Дзяніс. З майстэрні мастака мы прывозім жбаны, праз якія ўвасобім вузлы на дарозе. На гэтых вузлах і адбываецца мікрадзеянне, разгортваецца мікражыццё, за якім мы будзем назіраць: што магло адбывацца ў беларускіх хатах, у якія мог трапіць у свой час наш герой. На сцэну выйдуць 17 беларусак у нацыянальных строях, рэканструяваных па ўзорах Раманюка (па яго эскізах цяпер працуе «Скарбніца»). Фальклорны пласт прадставяць гурты «Госціца», «Горынь», этнасуполка БДУ. Дапамагаюць у працы над спектаклем студэнты Беларускай акадэміі мастацтваў.

Сцэна нават візуальна падзяляецца на 2 зоны: этнічную і інтэлектуальную. У інтэлектуальнай зоне гучаць думкі Готфрыда Лейбніца, Тэадора Гофмана, Томаса Мана, Альбера Камю, Івана Мележа, Кузьмы Чорнага, Алеся Гаруна, Рыгора Барадуліна, Уладзіміра Караткевіча. Камерны аркестр Рэспублікі Беларусь будзе выконваць музыку Антоніа Вівальдзі, Арканджэла Карэлі, Эмануэля Баха і іншую высокую класіку. Мне б хацелася, каб ва ўступным слове (а тут яно неабходнае) Дзяніс Раманюк сказаў, што кожны, хто ў зале, ужо сваім прыходам спявае гімн гэтаму чалавеку.

Стаянне на каленях

— Я даўно прытрымліваюся думкі, што ў творчасці нават адзінкавы стрэл (паказ) трапляе ў цэль. Пасля застаецца энергетычны шлейф, тое, што чалавек у сабе носіць, і яно можа ўключацца ў любыя моманты жыцця нечакана. І калі дагэтуль кімсьці ўзгадваецца прысвячэнне Багдановічу, то значыць, гэта не прайшло дарэмна, і вы ў сабе носіце яго вобраз. Часам дастаткова і аднаго разу, каб твор працягваў жыць у людзях. Не, я не супраць, каб мае творы «Апокрыф» ці «Люцыян Таполя» паставілі ў тэатрах. Але для імпрэз аднаго дня хай застанецца месца. Проста, калі да мяне прыходзіць ідэя і ёсць магчымасць яе ўвасобіць, то я разумею: трэба рабіць. Ты задумваеш твор, праз які будуеш свой творчы рай, пакутліва клапоцішся пра тое, як яго матэрыялізаваць. І калі разумееш, што ўсё складваецца, то ў табе пасяляецца неверагодная радасць, якая іскрыцца, зіхаціць, і сама радуецца ад адчування шчасця быць! І соцыум таксама гэтую радасць адчувае... Не заўсёды радасцю адказвае — вось гэта вельмі балюча. Твой ідэальны свет можа быць разбураны... Але кожны раз я пераконваю сябе, што трэба ўзнімацца з руін і працаваць далей, таму што ёсць творчасць, ёсць абавязак перад жыццём. Угаворваю сябе, што шлях творчы падобны да шляху воіна, а ў ім важна нікому не скардзіцца, а проста рабіць сваю справу. Ніхто Багдановіча воінам не называў пры жыцці, ніхто Раманюка не называў так. Але ў іх былі ўчынкі і жыццё воінаў. Мне здаецца, што ёсць чалавечыя ўчынкі, перад якімі анёлы становяцца на калені. Не проста ахоўваюць і дапамагаюць. Мяне гэта пазбаўляе ад усіх адгаворак і апраўданняў, што я магла б нечага не рабіць. Спектакль «Вандроўнік» — маё стаянне на каленях перад жыццём Міхася Раманюка.

Ларыса ЦІМОШЫК